Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (710) Пятніца 24 мая 1968 г. Год выдання XXI Цана 2 кап.



# ВУЧОБА І ПРАЦА ПОРУЧ ІДУЦЬ

МЫ ЗНАХОДЗІМСЯ НА СКРЫЖАВАННІ ДВУХ СЕМЕСТРАЎ. ЧЫМ БЛІЖЭЙ ДА НАС ФІНІШ ДРУГОГА НАВУЧАЛЬНАГА, ТЫМ БЛІЖЭЙ СТАРТ ТРЭЦЯГА—ПРАЦОЎНАГА, ЦІ НЕ ТАМУ УНІВЕРСІТЭТ ЦЯПЕР У РЫТМЕ НАПРУЖАНАГА, НЕСПАКОЙНАГА ЖЫЦЦЯ? АБАРАНЯЮЦЦА ДЫПЛОМНЫЯ РАБОТЫ, ЗДАЮЦЦА ЗАЛІКІ, ІДЗЕ СТАРАННАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА ЭКЗАМЕНАЎ І... ДА ТРЭЦЯГА, УДАРНАГА, ПРАЦОЎНАГА.

АБ ГЭТЫМ МЫ РАСКАЗВАЕМ СЁННЯ НА СТАРОНКАХ НАШАЙ ГАЗЕТЫ.

## ХРОНІКА ПАРТЫЙНАГА ЖЫЦЦЯ

● Задачы партыйнай прапаганды на перыяд падрыхтоўкі да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі абмеркавалі на сваім сходзе камуністы гістарычнага факультэта. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў прафесар М. Я. Шкляр. Сход пастанавіў, што кожны выкладчык і студэнт за час, які застаўся да юбілею, павінен прачытаць дзве-тры лекцыі аб дасягненнях рэспублікі ў сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве, аб поспехах універсітэта.

Гісторыкі арганізуюць цыкл лекцый па юбілейнай тэматыцы на аўтамабільным заводзе. Шэраг цікавых мерапрыемстваў намечана правесці на факультэце. У прыватнасці, вырашана падрыхтаваць матэрыялы да біяграфічнага слоўніка выпускнікоў гістфака.

● Партыйная арганізацыя хімфака падрабязна абмеркавала ход падрыхтоўкі да экзаменацыйнай сесіі. На сходзе адзначалася, што большасць студэнтаў старанна працуе над праграмным матэрыялам, а многія ўжо здалі экзамены па асновах навуковага атэізма і іншых прадметах. Аднак дакладчык і выступіўшыя ў спрэчках галоўную ўвагу звярнулі на нявырашаныя задачы, выказалі канкрэтныя прапановы па арганізаванаму правядзенню экзаменаў.

## ЗАКАЛКА ПРАКТЫКАЙ

Многа часу і сіл патрацілі студэнты чацвёртага курса, каб паспяхова здаць экзаменацыйную сесію, якая праходзіла з 25 красавіка па 8 мая. Са 100 чалавек закончылі тэарэтычны курс на «выдатна» — 10. Сярод апошніх сакратар камітэта камсамола факультэта П. Кахнюк, члены камсамольскага бюро курса Л. Сычова, Л. Палякова, стараста групы В. Ароздава, спартсменка-разрадніца Т. Ліцкевіч і іншыя. Каля 50 чалавек здалі экзамены на «добра» і «выдатна». Паспяхова справіліся студэнты з такім складаным прадметам, як навуковы камунізм. (лекцыі чытаў І. І. Власенка, семінарскія заняткі праводзіў Ф. І. Варанковіч). Вынік экзамена—33 выдатных, 48—добрых і толькі 19 здавальняючых адзнак. Некалькі слабей здадзен экзамен па дарвінізму і гісторыі эвалюцыйнага вучэння, але і гэта ў асноўным тлумачыцца тым, што не хапае патрэбнай літаратуры па курсу ў бібліятэцы.

Курсавыя работы студэнты выканалі толькі на «выдатна» і «добра», за выключэннем адной, ацэненай на «здавальняюча».

З 10 мая ў старшакурснікаў пачалася вытворчая практыка, студэнты практыкуюцца ў лабараторыях АН БССР у прафесараў А. А. Шлыка, А. С. Вечара, Л. С. Чаркасавай, на біястанцыі на возеры Нарач, у вучэбнай гаспадарцы Шчэмысліцы і ў дзяржаўным запаведніку «Асканія-Нова», у саўгасе «Русіновічы» і на кафедрах факультэта БДУ.

На першым, другім, трэціх курсах ідзе напружаная падрыхтоўка да экзаменацыйнай сесіі, якая пачнецца з першага чэрвеня. Пасля сесіі і гэтыя студэнты раз'едуцца на летнюю практыку. Першакурснікі з 15 чэрвеня на чале з вопытнымі выкладчыкамі паедуць на сямітыднёвую практыку на возера Нарач.

У Налібокскай пушчы Валожынскага раёна пачнецца вучэбная практыка другога курса. А многія студэнты трэцяга курса паедуць на вытворчую практыку ў Мурманскую вобласць, у Кандалакшскі дзяржаўны запаведнік, дзе ім будуць створаны неабходныя ўмовы для збору матэрыялаў для курсавых работ.

М. ЖАЛЕЗКІН,
метадыст біяфака.

## ДЫПЛОМНІКІ АБАРАНЯЮЦЦА...

Старшыня дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры прафесар Юльян Сяргеевіч Пшыркоў аб'яўляе:

— Пра сваю дыпломную работу, аб працы над ёй раскажа студэнтка-завочніца Анна Аляксандраўна Шкленік.

Да кафедры падыходзіць невысокага росту жанчына, сціплая, крышку ўсхваляваная:

— Тэма маёй дыпломнай работы — «Аповесць Васіля Быкава «Альпійская балада». Чаму я выбрала гэту тэму? Мне асабіста зразумелыя і добра вядомыя перажыванні і ўчынкі герояў гэтай аповесці Васіля Быкава. Дзіцём я была разам з маці вывезена гітлераўцамі далёка за межы роднай Беларусі, у Германію. І хоць у той час я не дасягнула яшчэ і школьнага ўзросту, мне на ўсё жыццё запомнілася катаржнае жыццё нявольніц-паланянак, дагэтуль перад вачамі стаяць вобразы савецкіх салдат, якія вызвалілі нас з палону...

Двойчы на тыдзень у актавай зале філалагічнага факультэта ва ўрачыстых абставінах абараняюць дыпломныя работы студэнты-выпускнікі. Адбылося ўжо некалькі пасяджэнняў дзяржаўнай камісіі, і сёння можна падвесці пэўныя вынікі.

Радасна, што, насуперак вядомай прымаўцы «першы блін — комам», менавіта першыя дыпломнікі — сёння яны ўжо маладыя спецыялісты — паказалі добрыя веды па філалогіі. Сведчанне гэтаму — высокія адзнакі, якімі ацаніла камісія іх дыпломныя працы. Работы С. А. Прасняка «Валянцін Таўлай — паэт і змагар» (кір. А. А. Лойка), Г. С. Пагуды «Аповесць А. Кулакоўскага «Нявестка» (кір. С. А. Гусак). І. С. Кавалеўскай «Вобраз становучага героя ў беларускіх народных казках» (кір. Н. С. Гілевіч), Л. І. Чумак «Вобраз народнага важака ў «Палескай хроніцы» Івана Мележа» (кір. В. В. Казлова) і некаторыя іншыя — гэта цікавыя самастойныя даследаванні, якія ўносяць нешта новае ў наша разуменне асобных фактаў беларускай літаратуры і фальклору. Безумоўна, каб напісаць такія даследаванні, трэба любіць літаратуру, ведаць законы яе развіцця, мець глыбокую тэарэтычную падрыхтоўку, пэўныя навыкі літаратуразнаўчага аналізу.

Цікавая асаблівасць сёлетніх дыпломных работ — у іх цяснейшай, у параўнанні з мінулымі гадамі, сувязі з жыццём, з практыкай. Выкладчыкі, кіруючыся вядомымі партыйнымі рашэннямі, скіроўваюць сваіх выхаванцаў на шлях практычнага выкарыстання іх ведаў, на распрацоўку такіх пытанняў, якія маюць непасрэднае сутыкненне з практыкай, са школьнай працай. Дастаткова сказаць, што літаральна ўсе тэмы дыпломных работ выразна перагукваюцца з тэмамі па літаратуры і мове, якія вывучаюцца, на якія звяртаецца ўвага ў сярэдняй школе. Больш таго, сёлета асаблівае значэнне надавалася тэмам па методыцы выкладання філалагічных дысцыплін у школе. І трэба сказаць, што ў большасці выпадкаў дыпломнікі (а такія тэмы бралі, за рэдкім выключэннем, толькі завочнікі, якія маюць багаты педагагічны вопыт) добра справіліся з імі. Так, напрыклад, выпускнік Г. П. Журавель (кір. Л. А. Царанкоў), які працаваў над пытаннем атэістычнага выхавання на ўроках беларускай літаратуры ў V—VIII класах, абагуліў свой вопыт, выказаў свае канкрэтныя прапановы аб больш дзейсным змаганні з уплывам рэлігійнай ідэалогіі на свядомасць школьнікаў. Такія прапановы тым каштоўныя, што яны грунтуюцца на цікавым фактычным матэрыяле: на тэрыторыі сельсавета, дзе размешчана школа, існуе баптысцкая секта.

У дыпломнай рабоце «Вывучэнне фанетыкі ў 5-ым класе» настаўніца В. В. Маслоўская распрацавала ажно 27 урокаў! Кіраўнік работы заслужаны дзеяч навукі БССР, вопытны педагог М. І. Жыркевіч адзначыў, што распрацоўкі могуць быць з поспехам выкарыстаны і іншымі настаўнікамі, параіў дыпломніцы выступіць з дакладам на настаўніцкай канферэнцыі.

Хочацца, аднак, падкрэсліць, што яшчэ не ўсе магчымасці па сувязях дыпломных работ з практыкай вычарпаны. Павучальнымі здаюцца плённыя вынікі па збору і даследаванню твораў вусна-паэтычнай творчасці роднага народа, праведзеныя Н. І. Багуцкай, А. А. Прышчэпай і іншымі пад кіраўніцтвам дацэнта Ніла Сямёнавіча Гілевіча. Дзесяткі песень, сотні прыпевак, сабраныя імі, зоймуць сваё месца ў фальклорных зборніках, якія рыхтуюцца да выдання. Ці ж гэта не сувязь з практыкай! Відаць, і кафедры беларускай мовы трэба больш смела скіроўваць сваіх дыпломнікаў на збор і апрацоўку жывога моўнага матэрыялу, у прыватнасці дыялектнага. А чаму б не прапанаваць студэнтам-выпускнікам апрацаваць хоць невялікую частачку картак з багатай картатэкі мінска-маладзечанскіх гаворак?! Відаць, настаў той час, калі мы павінны думаць пра стварэнне слоўнікаў нашых пісьменнікаў-класікаў, накшталт «Словаря языка Пушкина». Распісаць пэўны твор пісьменніка па картачках і даць аналіз моўнага матэрыялу, думаецца, зусім па сіле для выпускніка-філолага. Калі б такая работа праводзілася па пэўнай метадалогіі і праграме, то ўжо праз некалькі год мы б мелі, напрыклад, «Слоўнік мовы Янкі Купалы». Пра карысць такога слоўніка і для купалазнаўства, і для нашага мовазнаўства гаварыць не прыходзіцца, яна відавочная! Падумаўшы, можна знайсці шмат вельмі патрэбных так званых прыкладных тэм для дыпломных работ. Канешне, імі нельга абмяжоўвацца, нельга ігнараваць чыста тэарэтычных даследаванняў, але важнасць іх — агульнапрызнаная, не патрабуе доказаў...

Дыпломнікі абараняюцца... Хочацца пажадаць ім ад душы: спору вам у працы, дарагія выпускнікі!

В. РАГОЙША,
ст. выкладчык, член дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі.

## ХВАЛЯВАННІ ЗАЛІКОВАЙ ПАРЫ

Пасля невялікага семестравага зацішша студэнцкія будні зноў напоўніліся хваляваннямі заліковай пары. Самая злабадзённая тэма цяпер — узорная падрыхтоўка да вясенняй экзаменацыйнай сесіі. Ёй прысвячаюцца партыйныя і камсамольскія сходы, выступленні насценнага друку.

Поўным ходам ідзе абарона курсавых і дыпломных работ.

Мы звярнуліся да члена дзяржаўнай камісіі прафесара Васіля Іванавіча Сцяпанава з просьбай расказаць, як прайшла абарона дыпломных работ выпускнікамі-завочнікамі філасофскага аддзялення.

— Дзевятнаццаць выпускнікоў філасофскага аддзялення распрацоўвалі актуальныя і цікавыя тэмы пад кіраўніцтвам выкладчыкаў у асноўным трох кафедр — дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма, навуковага камунізма, гісторыі філасофіі.

Найбольш цікавыя работы атрымалі высокія ацэнкі. Сярод іх дыпломнае даследаванне студэнта А. А. Зюзіна — «Антыкамунізм—галоўная ідэйна-палітычная зброя імперыялізма», зробленае пад кіраўніцтвам кандыдата філасофскіх навук дацэнта А. М. Паулючэнкі.

Выдатную работу прадставіў М. П. Міхайлоўскі—«Аб ролі навукі і навуковых даследаванняў у развіцці грамадства» (кіраўнік — дацэнт В. М. Панкратаў). Аўтару было зададзена многа пытанняў, ён добра абараняўся і заслужана атрымаў высокую адзнаку.

Сур'ёзна падышоў да распрацоўкі тэмы «Дыялектычнае вучэнне аб прычыннасці» Л. Я. Землякоў.

Цікавай з'яўляецца дыплмоная работа студэнта Ю. У. Карацеева. Непрымірымы антырэлігіёзнік, ён сабраў вялікі фактычны матэрыял пра сектантаў-пяцідзесятнікаў і ў сваёй працы расказаў аб метадах, якімі карыстаюцца пяцідзесятнікі, абаснаваў рэкамендацыі барацьбы з рэлігійнай ідэалогіяй.

Студэнта В. І. Колесава даўно цікавіць тэма інтэрнацыянальнай салідарнасці. На працягу некалькіх гадоў ён старанна збіраў матэрыялы, праходзячы службу ў радах Савецкай Арміі на тэрыторыі ГДР, працягваў працаваць над выбранай тэмай у нямецкіх бібліятэках, азнаёміўся з некаторымі архіўнымі матэрыяламі, сустракаўся з былымі чырвонагвардзейцамі і чырвонаармейцамі, ветэранамі нямецкага рабочага руху. Так накопліваўся матэрыял, пакладзены ў аснову яго дыпломнай працы «Развіццё форм інтэрнацыянальнай салідарнасці працоўных у сумеснай барацьбе народаў Савецкай Расіі і Германіі за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі (1917—1922 гг.)». Работа добра ілюстравана, змяшчае многа цікавых звестак і таму, як і шэраг іншых, рэкамендавана да апублікавання.

Побач з сур'ёзнымі, вялікімі, творчымі даследаваннямі, як адзначыў В. І. Сцяпанаў, ёсць і слабыя, такія, як работа П. Фіякціставa «Выхаванне волі як састаўная частка камуністычнага выхавання», ацэненая толькі здавальняюча.

Агульны вынік абароны— чатыры выдатных, восем добрых, сем здавальняючых адзнак.

Цяпер выпускнікі рыхтуюцца да апошняга выпрабавання — дзяржаўнага экзамена.

*Сесія завалодала думкамі і часам студэнтаў. І ў час перапынку на фізічным факультэце можна ўбачыць такую карціну.*

*Фота І. Аскіркі.*





# НАМ

### ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

**● У юбілейным годзе на будоўлі, сельскагаспадарчыя і меліярацыйныя работы, на прадпрыемствы, у калгасы і саўгасы Беларусі для ўдзелу ў трэцім працоўным семестры універсітэт пасылае каля 1000 студэнтаў.**

**● На фізічным факультэце сфарміравана 14 атрадаў,**
**на матфаку — 11,**
**на хімічным — 5,**
**на філфаку — 4,**
**на юрфаку — 4.**

**● Два інтэрнацыянальныя атрады будуць працаваць у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы і Чэхаславакіі. У сваю чаргу на будоўлі Беларусі ГДР і ЧССР пасылаюць таксама два атрады.**

## МАТФАК
## ЦАЛІНА-67

**Першыя студэнцкія будаўнічыя атрады ў Казахстане выконвалі работы, якія не патрабуюць высокай кваліфікацыі: рабілі саман, будавалі кашары. Цяпер жа кожнае лета ў казахстанскіх стэпах вырастаюць жылыя дамы і электрастанцыі, дамы культуры і цэлыя вуліцы, узведзеныя рукамі студэнтаў.**

**Весь і ў мінулым годзе тры атрады матэматыкаў працавалі на будаўніцтве Урала-Кушумскай сістэмы. Трэба было выканаць усе бетонныя работы на Ліމане-56, які ў будучым дасць ваду землям Першамайскага саўгаса Чапаеўскага раёна Уральскай вобласці.**

**Рабяты трапілі ў сапраўдныя цалінныя ўмовы. Гэта і казахстанскія адлегласці — да бліжэйшага саўгаса «Першамайскі» каля паўсотні кіламетраў — і прывазная вада, і стэпавыя прасторы. На незвычайныя ўмовы матфакаўцы таксама адказвалі незвычайным. Узнікла першая ў гісторыі студэнцкіх атрадаў міжатрадная камуна. За лічаныя дні ў стэпе вырас цэлы гарадок са сваімі «Эстраднай» і «Балотнай» вуліцамі і нават... бульварам Лысых.**

**Недалёка ад лагера пачаў працаваць свой бетонны завод. І хоць не так ужо многа вопыту было ў хлопцаў, але прайшло толькі крыху больш месяца, а сетка перагараджальных збудаванняў і каля сарака вадавыпускаў глядзелі ў стэп сваімі бетоннымі вачыма.**

**Выдатна працавалі брыгады Э. Ціхно, І. Гайшуна, А. Галіноўскага і многа іншых. Запамяталіся цудоўныя абеды А. Кірэевай і Н. Горбач, вячэрнія канцэрты нашых гітарыстаў Л. Дзеева, В. Нікалаенкава, тыя кінафільмы, якія, нягледзячы на вялікія адлегласці, усё ж траплялі да нас у лагер.**

**У гэтым годзе зноў адзін атрад матэматыкаў едзе на будаўніцтва Урала-Кушумскай сістэмы. На гэты раз ім прыдзецца прыкласці рукі да Бітыкскага гідравузла. Другі атрад будзе дапамагаць саўгасу Батурына.**

**Атрады ўжо поўнасцю сфарміраваны. Камандзіры і камісары зацверджаны на факультэцкім камітэце камсамола і партбюро. А пакуль што будучыя байцы «штурмуюць» функцыянальны аналіз і філасофію, дыферэнцыяльную геаметрыю і вышэйшую алгебру. Цаліны ж лозунг застаецца ў сіле — «На цаліну — без «хвастоў»!.**

**Р. АДАМЕНКА,**
**студэнт IV курса**
**матфака.**

# САМАЕ ВАЖНАЕ

Яшчэ зусім нядаўна спалучэнне слоў «трэці студэнцкі семестр» магло выклікаць здзіўленне. Зараз да яго прывыклі. Кожнае лета сотні студэнтаў нашага універсітэта вось ужо на працягу васьмі гадоў мяняюць аўдыторыі на абшары казахстанскіх стэпаў, тайгу Сібіры, гарачыню пустынь... Студэнты дапамагаюць будаваць і абжываць новыя раёны, але самае каштоўнае ў трэцім семестры тое, што гэтыя будоўлі сталі выдатнай школай працоўнага выхавання моладзі, школай сапраўднай мужнасці тысяч юнакоў і дзяўчат. І гэта вельмі важна.

Жадаючых паехаць на будоўлі Казахстана вельмі многа. Усталяваўся своеасаблівы конкурс. Пагэтаму штаб працоўных спраў універсітэта поўнасцю ўкамплектаваў атрады, падабраўшы надзейны калектыў з прадстаўнікоў «старых» і «маладых» цаліннікаў.

Сур'ёзна падышлі ў гэтым годзе да падбору камандзіраў і камісараў. Усе яны былі зацверджаны партыйнымі бюро факультэтаў, парткомам і камітэтам камсамола універсітэта.

Улічваючы тое, што цаліна — не толькі праца на аб'ектах, але і агляд калектыўнай спаенасці, умення заставацца ва ўсіх выпадках жыцця высокаарганізаванымі, штаб працоўных спраў універсітэта распрацаваў перспектыўны план агітацыйна-прапагандысцкай, спартыўнай, піянерскай і шэфскай работы. Гэты план стаў для камісараў своеасаблівай праграмай дзеяння. Ужо зараз праходзіць вучоба і камандзіраў, і камісараў, і піянерважатых лагераў — «Спутнікаў».

Паміж падшэфнымі школамі ўстаноўлена цесная сувязь з мэтай прыцягнуць піянераў да збору кніг і падарункаў для казахскіх школьнікаў.

Нашы студэнты раскажуць сябрам з Казахстана пра дасягненні Беларусі-юбіляра. Для гэтага мы падрыхтавалі цікавыя лекцыі, возьмем з сабой кіна-фотадакументы па ўсіх галінах культуры і гаспадаркі, пазнаёмім сяброў з песнямі і танцамі, пакажам сілу беларускіх спартсменаў.

Мы звярнуліся за дапамогай і ў бібліятэку нашага універсітэта — 300 экземпляраў дзіцячай і юнацкай літаратуры будуць перададзены ў якасці шэфскага падарунка уральскім чытачам.

Да адпраўлення эшалона засталося 34 дні. Да гэтай падзеі рыхтуюцца ўсе: і камандзіры, і будучыя цаліннікі 1968 года. Хутка пачнецца трэці будаўнічы семестр, які ўпіша ў працоўныя заліковыя кніжкі студэнтаў адзнакі за пабудаваныя дамы і школы, клубы і майстэрні, зернесклады і цеплацэнтралі.

**Г. ДАРОГІН,**
**камісар Чапаеўскага раённага штаба.**

*Сцяпан Данілевіч і Ліда Брыгадзіна — лепшыя муляры з атрада «Камета», які працаваў у Слуцкім раёне.*
*Фота Г. ПІШЧЫКА.*

*Цаліннікі ў працоўным рытме трэцяга семестра.*
*Фота С. СУПРУНА.*





## РАЗВЕДКА ДАКЛАДВАЕ: ЁСЦЬ ДЗЕ ПРЫКЛАСЦІ СІЛЫ!

*25 сакавіка*

Нядаўна вярнуўся з Пінска. Камандзіроўкай застаўся задаволены.

Сёння ў кішэні зноў «камандзіровачнае». На гэты раз ва Уральск. Наш адказны за цаліну Міша Шавыркін не даў вымавіць нават слова.

— Трэба, хлопцы, самі ведаеце, трэба... Трэба дык трэба. Са мной ляцяць старыя цалінныя «зубры», будучыя «вялікія гісторыкі» Барыс Марозаў, Мікола Мітраховіч, а таксама «Мендзялееў» з хімфака — Марат Круглікаў.

Сустрэнемся ў аэрапорце а дзевятай гадзіне...

*27 сакавіка*

За акном Волга. Чамусьці ўспамінаецца «Там вдали за рекой...» Кідаю праз акно ў Волгу мядзяк — наша цалінная традыцыя. Колькі іх тут! І ў кожным — маўклівая клятва — «я вернусь к тебе Россия».

Хлопцы адпачываюць. Двое у дарозе, а прыгод — хоць адбаўляй. У Маскве з прыгажуна АН-10 (вядома, не па ўласнаму жаданню) перасялі на цягнік.

*29 сакавіка*

Уральск сустрэў холадам і граззю. У гасцініцу «не дастукаліся». Катэгарычнае «месц няма» астудзіла наш пыл. Начуем у знаёмага саўгаснага дыспетчара... Раніцай кароткі збор і інструктаж у абкоме камсамола. Тут наш «беларускі прадстаўнік» Валодзя Веркашынскі. Свае боты (адзіныя на чатыры чалавекі) аддаю Міколаю. Ён з Барысам і Маратам ад'язджае ў Чапаева, на месца будучай дыслакацыі нашага райштаба. Месцы гераічныя і для нас, ветэранаў-цаліннікаў, добра знаёмыя і абжытыя. Сам затрымліваюся на некалькі дзён ва Уральску для «сувязі» з рабятамі і яшчэ каб удакладніць у трэсце «Уральскводбуд» месца і аб'ём работ на далёкім стэпавым канале Урала-Кушумскай сістэмы.

*1 красавіка*

Звестак ад рабят пакуль ніякіх. Другі дзень, змяняючыся па чарзе, сядзім з Валодзем Веркашынскім на тэлефоне. Два разы здавалася вось-вось «дадзвынкаемся» да рабят. Марная надзея. Першы раз адгукнуўся Гур'еў, другі, здаецца, Петрапаўлаўск - на - Камчатцы. Ну і вытрымка ў гэтага тэлефона. Людзі ў параўнанні з ім — мякчэй волава.

*4 красавіка*

Нарэшце сабраліся ўсе ва Уральску. У кожнага з нас па два заключаных дагаворы з саўгасамі. Прыкідваем у агульных рысах аб'ём работ. Вынік заспакойвае — ёсць дзе прыкласці сілы. Са старых знаёмых саўгасы «Усход», «Чапаеўскі», «Першамайскі», «Алгабажскі» і імя Батурына. Давядзецца будаваць таксама і канал. Ды не толькі канал, але і ўсю гідрасістэму. Аб'ём работ вялікі — трэба асвоіць каля семсот тысяч рублёў. Для трыста дваццаці чалавек — гэта двухмесячная напружаная работа, а ў папулярным вызначэнні — гэта каля трыццаці жыллёвых будынкаў, каля сотні гаспадарчых збудаванняў: яслі, школы, новыя вуліцы, дзесяткі кіламетраў канала, сотні і тысяч гектараў абводненай зямлі.

Рабяты стомленыя. Пашарпаныя і няголеныя. Не чуваць жартаў. Не да іх. Стэп суровы летам і зімой, і яшчэ больш патрабавальны ён да чалавека восенню і вясной.

Ён, як «вампір», выціснуў з рабят усё. А колькі яшчэ пральецца поту і ўскочыць крывавых мазалёў за тыя два месяцы летняй работы, каб гэты наравісты і дзікі стэп стаў больш лагодным і карысным чалавеку.

Рабяты адлятаюць раніцай. Моўчкі ціснем рукі адзін другому. Барыс ідзе першым. За ім Марат. Мікола нешта хоча сказаць, але моўчкі круціць галавой, лашчыць нас па плячы і адварочваецца. Нам таксама хочацца ў Мінск, але мы застаемся.

*6 красавіка*

Мясцовае радыё перадае вясёлую музыку. Дыктар так горача гаворыць пра вясну, быццам і сапраўды перадача вядзецца не за некалькі кварталаў, а з узбярэжжа Чорнага мора.

*7 красавіка*

Добры дзень, Мінск! Нарэшце я вярнуўся дадому пасля кароткай сустрэчы з сваім «блакітным шчасцем». З самалёта мне не давялося кінуць у Волгу мядзяк. Але чым далей адлятаў я ад Волгі, тым мацней хацелася павярнуць хоць на мінуту назад. Дзівак гэты чалавек. Сам сабе шукае цяжкасцей.

Колькі ў мяне родных мясцін? Аднак, шмат. Цэлы Саюз Саветаў. Чаму аддаць перавагу? Я люблю Беларусь і зноў хачу паглядзець планету-цаліну.

— Там цяжка, там усё не так. Дзівак, і што ты там пакінуў? Пяцікапеечную манетку?

— Свой неспакой і любоў да зямлі.

*Ан. ЯРОХІН.*

# ГАРЫЗОНТЫ ЖЫЦЬ СПАКОЙНА НЕ ДАЮЦЬ

**ЛІЧБЫ І ФАКТЫ**

**● Летам гэтага года 300 студэнтаў нашага універсітэта будуць працаваць на будоўлях Казахстана.**

**● За два месяцы яны асвояць 669900 рублёў капіталаўкладанняў.**

**● Студэнты пабудуюць 30 жылых дамоў, тры школы і адну школу-інтэрнат на 154 месцы, тры магазіны, два клубы, пяць жывёлагадоўчых памяшканняў, два склады, тры цеплацэнтралі.**

## КАМАНДЗІР

Гэта не той, што перацягнуты рамянямі, у крылатай бурцы рваўся на ўзмыленым кані наперадзе лавіны коннікаў. Не падобны ён і да таго, хто падымаў салдат насустрач сталёвай віхуры куль. Але, калі раніцай прагучыць каманда «Смірна!», а на флагштоку паволі паплыве ўгару сцяг, строй замрэ, падуласны голасу камандзіра. Ён стаіць перад фронтам сваіх байцоў, загарэлы, мужны, з адбітай на твары рашучасцю. Строй заціхне, бо кожны баец-цаліннік чакае ад свайго камандзіра нечага новага, мудрага, што абавязкова будзе найлепшым чынам спрыяць агульнай справе атрада. Ён павінен ведаць, дзе ўзяць шыфер на дахі, хоць усім добра вядома, што ў саўгасе і раёне няма ні ліста, адкуль прывезці лес, які ў Казахстане з'яўляецца асноўным дэфіцытам. Нарэшце, дзе ўзяць яшчэ хоць бы дваццаць працавітых рук, бо работы прыбавілася столькі, што сорак чалавек не могуць справіцца. Словы і думкі яго бадзёраць тых, хто на хвіліну сумеўся ў сваіх сілах, спужаўся цяжкасцей. Ведае камандзір, што сэрцы байцоў б'юцца ў адным рытме, што думкі ўсіх накіраваны на адно: своечасова пабудаваць свой пасёлак. Таму байцы чакаюць ад яго справы. У іх чэшуцца рукі, смага да працы перамагае спякоту. Яны ўжо ведаюць, што ноччу вярнуўся камандзір з вобласці, што недзе там, яшчэ за сотні кіламетраў, ужо ідуць грузавікі з цэментам, цэглай, лесам. Гэта не ўпала з неба, камандзір — не бог. Але ніхто не пытаецца, дзе і якім чынам удалося яму «выбіць» неабходныя будматэрыялы, толькі кожны баец ведае, што белыя дахі пакрыюць іх дамы, і каміны пусцяць у неба струмені дыму. Яшчэ ўважлівей лавілі хлопцы словы свайго важака...

«...Тое, што мы распачалі, мы абавязкова пабудуем. Ад нас залежыць — калі і як. Да 1 жніўня ўсе аб'екты нам патрэбна ўзвесці пад стрэхі. Гэта — бліжэйшы рубеж. У нас хопіць сіл і ўмення, толькі іх трэба знайсці ў сябе. Разам закасаем рукавы і па цагліне вылепім нашу Юбілейную вуліцу...»

Рассыплецца строй, зазвіняць сякеры, напружана загудуць спрацаваныя маторы, будоўля закіпіць з новай сілай. На аб'ектах будзе з'яўляцца камандзір, акідваючы гаспадарскім вокам збудаванне і амаль заўсёды застанецца незадаволены чым-небудзь. Але байцы разумеюць гэта як пастаянны клопат, як жаданне збудаваць дом як мага хутчэй і лепш. А камандзір ужо недзе на цэнтральнай сядзібе саўгаса. Цэламу гурту саўгасных гаспадароў патрэбна цярпліва расталкоўваць, што ў студэнтаў прымаўка «Летні дзень год корміць» набыла самае патрыятычнае значэнне, і, калі піларама не запрацуе сёння, ні падлогі, ні вокан у дамах не будзе.

Дзе б ні быў камандзір, усе яго думкі з атрадам. Яго разумная воля, правільнае выкарыстанне права асабістага ўзначальвання аб'ядноўвае людзей, падпарадкоўвае іх адзінай мэце.

Цаліна выхавала не аднаго добрага камандзіра, у якіх абавязкова павінны вучыцца тыя, хто вырашыў узначаліць нашы атрады ў гэтым годзе. У Пятра Пабокі патрэбна вучыцца мужнасці, у Івана Цвырко — усе ўмець, у Аркадзя Баброва весялосці і ўмення аднойчы і назаўсёды выклікаць да сябе прыхільнасць людзей, у Алега Слукі — «з калена выламаць» неабходны будаўнічы матэрыял. Гэтых важакоў надоўга запамятаюць былыя цалліннікі. Не дзеля асабістай славы разам з байцамі атрадаў заваёўвалі яны першыя месцы, прывозілі ва універсітэт сцягі пашаны і гонару. Яны кіраваліся партыйным сумленнем і ўсведамленнем дзяржаўнай важнасці працоўнага семестра, верылі ў сілу сваіх байцоў.

**М. БЕЛЯНКЕВІЧ.**

*СЯРГЕЙ ЗАКОННІКАЎ*

## ТОЙ

**Ходзіць ходарам кроў у жылах,**
**Як на месцы ты ўстоіш!**
**Не стой!**
**Ногі, ногі свае беражыце,**
**Пачынаецца той.**
**Дайце, дайце танцорам прыволле,**
**Не пытайцеся: дзіўна, чаму**
**Закруціў, можа, ў дваццаць стволак**
**Аксакал[2], нібы вежу, чалму.**
**Лепш на стол, на абрус паглядзіце,**
**Аж язык праглынеш — гэткі смак!**
**Гаспадыня ядой дагадзіла—**
**Царскі звараны бішбармак[3],**
**А вунь тонкая, як націначка,**
**Выплывае дзяўчына ў круг,**
**І дамбра гучна струнамі ціўкае:**
**Хто яшчэ, хто яшчэ.—гавару.**
**І, сарваўшыся раптам з месца,**
**Б'е абцасам з усёй нагі,**
**Нібы хоча ўзляцець да месяца,**
**Чарнабровы джыгіт.**
**Ну і кружацца, ну і кружацца,**
**Вось яна, азіяцкая кроў!**
**І ад воплескаў пухнуць рукі,**
**Загарэлыя рукі сяброў.**
**Нават сонца не мкне да захаду,**
**Над адной павісла вярстой.**
**Хоць я сам гасцюю ў казахаў, —**
**запрашаю усіх на той.**

1. Той—казахскае свята.
2. Аксакал—зваротак да паважанага старога чалавека.
3. Бішбармак — нацыянальнае блюда.



*У Дзень будаўніка, 14 жніўня, камандзір атрада «Шторм» Пётр Пабока рапартаваў камандзіру Чапаева-Тайпакскага раённага штаба М. Траццяку аб поспехах на будаўнічым фронце (злева).*



*На ціхім беразе Кушума, пад шырокім зорным небам адпачывалі студэнты пасля гарачага працоўнага дня.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

## ВЕТРАЗЬ

Вы памятаеце пунсовыя ветразі Грына? Яго прыгожыя, рамантычныя падарожжы, яго герояў, закаханых у жыццё, мужных, смелых, пяшчотных...

Нешта падобнае перажылі і мы ў саўгасе «Рассвет» Мінскага раёна, дзе дыслацыраваўся наш будаўнічы атрад. Наш «Ветразь», як крыло магутнай птушкі, залунаў ярка-чырвоным сцягам на высокім флагштоку. Мы не адпраўляліся на прагулку, а прыехалі будаваць памяшканні для сельскагаспадарчых патрэб.

З самага ранку, па ўказцы нашага камандзіра Аляксея Сімановіча, мы працавалі без стомы на аб'ектах. Сапраўды, ніхто ні аднаго разу не засмуціўся, не выказаў незадаволенасці, наадварот, было вельмі прыемна адчуваць, што справа ладзіцца, што побач твае добрыя таварышы.

Усе зайздросцілі спрытнай рабоце муляроў Валі Сімалавай, Гены Фядотава, Сяргея Дзялендзіка. Думалі: што тут складанага — выкладваць цагляную сцяну? Але гэта, бадай, цяжэй за экзамен ці залік. бо калі аднойчы «заваліш» прадмет, то з дазволу добрага выкладчыка атрымаеш магчымасць пераздаць. Але вось калі вугал выведзеш спіраллю, то сораму і бяды не абярэшся, і ў нашай насценнай газеце «З пяром і кельмай» размалююць, і камандзір выкліча на кавёр. Да гэтага ж Аляксей так жаласліва лаяўся, што ўсё роўна сам быў вінаваты за нашы грахі. Тады цэгла снілася цэлымі начамі, хоць і спалі мы мала. Дзе ж заснеш, калі над рэчкай туман наладзіў сховішча, а месяц заслухаўся салаўя. Нават песні дзяўчат растварыліся ў прасторы, і змоўк наш баян. Такой парой, здаецца, пяшчота нейкім асаблівым дажджом апускаецца на зямлю, робіць людзей аднолькава чулымі, ласкавымі.

Мы зразумелі, што багацце жыцця і рамантыка не толькі ў тым, што іх трэба шукаць за сотні вёрст. Члены нашага атрада адчулі сэрцамі, колькі неадкрытага харэства ў нашай Беларусі, колькі працы чакае маладых студэнцкіх рук.

Не ведаю, чым растлумачыць, але поспех не пакідаў нас. Можа, прычына гэтага ў нашай згуртаванасці, таварысцкай дапамозе і высокай дысцыпліне нашага атрада?..

Мы закончылі ў тэрмін свае аб'екты і амаль з жалем пакінулі вёску, новы двор, дзе перажылі столькі прыемных хвілін. Ды наш «Ветразь» не закончыў на гэтым сваё плаванне. Восенню, са значна папоўненай камандай, атрад адбыў у Слуцк. Атрад кароткі тэрмін працаваў на цукровым заводзе, дзе хутка ўзняліся сцены гаража.

Наш «Ветразь» пазнаў рамантыку адкрыццяў, радасць стваральнікаў, пакінуў у душы кожнага байца жаданне працы.

Разыйдуцца па свеце нашы байцы, а ў памяці назаўсёды застанецца. як жыццёвы вымпел ветразь нашага атрада.

**С. КРЭПСКІ,**
**студэнт II курса філфака.**





**Часта, не зважаючы на спякотнае сонца і не чуючы стомы пасля работы, хлопцы выходзілі на спартыўныя пляцоўкі, каб і тут памерацца сіламі і майстэрствам.**

**Фота І. АСКІРКІ.**

**На свята рыбакоў, якое праводзілася на возеры Чалкар, былі запрошаны і студэнты-будаўнікі — пасланцы універсітэта.**

**Фота С. СУПРУНА.**

